достичь органического единства целого ряда составляющих – государственной национальной политики, поддержки институтов гражданского общества и институтов научного сообщества, гармонизации принципов моно- и поликультурности в образовательном процессе.


1. *Соссюр, Ф.* Труды по языкознанию / Ф. Соссюр. – М. : Прогресс, 1977. – 695 с.

2. *Фуко, М.* Слова и вещи. Археология гуманитарных наук / М. Фуко. – СПб. : A-cad, 1994. – 405 с.

3. *Хайдеггер, М.* Закон тождества / М. Хайдеггер. Разговор на проселочной дороге. – М. : Высш. шк., 1991. – 192 с.

4. *Хайдеггер, М.* Письмо о гуманизме / М. Хайдеггер // Время и бытие. – М. : Республика, 1993. – 405 с.

5. *Шкраба, У. Р.* Слоўнік беларускай безэквівалентнай лексікі / У. Р. Шкраба. – Мінск : БелЭн., 2008. – 318 с.



***А. І. Бабко,***
*канд. філасофскіх навук, дац.,*
*дац. каф. філасофіі БДУКМ*


## ПРАБЛЕМА МЕСЦА І РОЛІ ФІЛАСОФСКІХ ВЕДАЎ У ДЫЯЛОГУ КУЛЬТУР

Дыялог як спосаб быцця чалавека (паводле М. М. Бахціна, «быць – значыць камунікаваць дыялагічна» [1, с. 284]), тоіць у сабе грунтоўны духоўны, стваральны, культуратворчы патэнцыял. Каб раскрыць і задзейнічаць яго, дыялагічныя зносіны павінны здзейсніцца адпаведным сваёй існасці чынам, атрымаць адэкватную форму свайго самаўвасаблення. (Найбольш адэкватным яно будзе ў тым выпадку, калі кожны аспект дыялога выявіцца як жыццёва важны для яго – раўнапраўных! – удзельнікаў, якія, значыцца, будуць браць у ім чынны ўдзел.) Дадзенае патрабаванне мае моц, натуральна, не толькі на ўзроўні міжасобасных стасункаў – яно рэлевантна для дыялагічных узаемадачыненняў усякага кшталту, у тым ліку і для міжкультурных камунікацый.

У сувязі з гэтым важным падаецца пытанне пра месца і ролю філасофіі ў працэсе рэалізацыі высокага духоўнага патэнцыялу дыялагічных формаў узаемадзеяння культур, у плане забеспячэння плённага разгортвання міжкультурнага дыялога. Віда-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вочна, што пошукі ўцямнага і слушнага адказу на яго застануцца безвыніковымі, калі папярэдне не акрэсліць місію філасофскіх ведаў у культуры, іх агульнакультурнае значэнне.

Найважнейшай адзнакай культуры як духоўнага ўтварэння з'яўляецца рэфлексіўны момант (пункт погляду, згодна з якім духоўнае характарызуецца найперш веданнем, усведамленнем, вызначэннем сябе ў самім сабе знайшоў яскравае выяўленне ў нямецкім ідэалізме, у першую чаргу ў творчасці Гегеля). Філасофія з яе рэфлексіўнай існасцю якраз і пакліканая здзейсніць гэты момант у працэсе культуратворчасці, яна валодае ўсім неабходным для такога чыну. У выніку адпаведных намаганняў, г. зн. у філасофскіх ведах, раскрываецца ідэальная падстава, ідэя агульначалавечай культуры (зноўку ў згодзе з гегелеўскім разуменнем паняцця ідэі, у рамках якога падкрэсліваецца яе сінтэтычны характар: мысленне выступае ў ёй як тоеснае быццю, суб'ект непадзельна з'яднаны з аб'ектам, паняцце знаходзіць адпаведную яму аб'ектыўную вонкавасць; пры гэтым дадзеная тоеснасць, еднасць і адпаведнасць мае праз сваю ўнутраную супярэчлівасць рухомы характар, здзяйсняецца як працэс).

Паколькі, аднак,усеагульнае выходзіць у рэчаіснасць пэўным, адмысловым чынам, дык і філасофскія веды ўвасабляюцца ў пэўнай, асаблівай форме, выяўляючы агульначалавечае ў аспекце яго здзяйснення, ажыццяўлення, канкрэтызацыі і раскрываючы, значыцца, ідэальны падмурак канкрэтных, існых у тую ці іншую гістарычную эпоху культурных утварэнняў розных узроўняў – і найперш нацыянальных культур. Таму нацыянальная філасофія выступае як найбольш глыбокі і адэкватны спосаб усведамлення пэўным народам сваёй ідэі, сваёй адметнасці і самаідэнтычнасці, спецыфікі сваёй культуры як выяўлення ўніверсальнага, агульначалавечага пачатку. Адсюль вынікае неправамернасць і няслушнасць яе разгляду толькі як шараговага сегмента культурнага цэлага, што проста суіснуе з іншымі культурнымі феноменамі, – яна нясе ў сабе нешта значна большае, прасякаючы сабой кожную праяву культурнага жыцця, суправаджаючы кожны акт культуратворчасці. (У пэўным сэнсе падобную сітуацыю Кант убачыў у чалавечым пазнанні: прынцып сінтэтычнага адзінства апперцэпцыі, яго простае выяўленне праз усведамленне факта свайго мыслення здзяйсняецца на кожным кірунку, на якім задзейнічаны розум, і суправаджае кожны акт яго ўжывання [8, с. 138–140].)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Менавіта таму надта дзіўным падаецца «бачыць адукаваны народ без метафізікі, – нібы храм, упрыгожаны разнастайным і дыхтоўным чынам, але пазбаўлены самага святога» [7, с. 3]. (Тут і далей пераклад мой. – *А.Б.*)

У адпаведнасці з гэтым у сферы міжкультурнага дыялога філасофіі наканавана выканаць ролю яго глыбокай (хоць і не заўжды яўнай) падставы, важнай і рэлевантнай для ўсіх яго аспектаў і кірункаў. Умовай магчымасці здзяйснення ёю згаданай місіі з'яўляецца найперш яе ўласная дыялагічная натура. У дадзенай сувязі неабходна падкрэсліць, што міжкультурныя дыялагічныя стасункі на ўласна філасофскім (прафесійным) узроўні ўжо самі па сабе (безадносна да іх грунтоўнай важнасці для іншых формаў, феноменаў і працэсаў, у якіх увасабляецца дыялог культур) маюць надзвычай высокі каштоўнасны статус (які грунтуецца на самакаштоўнасці філасофскіх ведаў).

Міжкультурныя ўзаемадзеянні ў абсягу філасофіі характарызуюцца разнастайнасцю і багаццем шляхоў, праяў і формаў: ад непасрэдных кантактаў паміж прадстаўнікамі розных нацыянальных філасофскіх традыцый да філасофскіх перакладаў. Рэфлексіўна-крытычная існасць філасофскага пазнання выяўляецца і ў гэтым аспекце яго самаразгортвання: сярод яго вынікаў важнае месца займаюць і такія тэарэтычныя сістэмы, што маюць на мэце высвятленне ўмоў, падстаў і сутнасці дыялагічных стасункаў і на яго ўласным узроўні, і ў агульнакультурным плане.

Як і ў іншых сферах філасофскага мыслення, на дадзеным яго кірунку распрацоўваюцца і здзяйсняюцца розныя канцэптуальныя стратэгіі. Найбольш вядомую і распаўсюджаную сярод іх прапанавала філасофская герменеўтыка, у рамках якой выразна падкрэсліваецца дыялагічна-гістарычная натура разумення і інтэрпрэтацыі. Пры гэтым гістарычнасць іх суб'екта (ягоная прыналежнасць да пэўнага гістарычна-культурнага кола) разглядаецца не як перашкода на шляху іх дасягнення, а як яго сапраўдная перадумова. Дадзены момант зусім не азначае, аднак, што філасофская герменеўтыка патурае адвольным суб'ектыўным меркаванням: яна скіроўвае позірк інтэрпрэтатара на сутнасць справы, пра якую ідзе гаворка, і гэта павінна дысцыплінаваць яго (гэтаксама як і ўсведамленне непазбежнай прадузятасці сваёй першапачатковай пазіцыі ў дачыненні да яе) [5, с. 1070].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Грунтоўнай характарыстыкай філасофска-герменеўтычнай канцэпцыі з’яўляецца таксама засяроджанасць на моўнай (як найбольш адэкватнай) форме рэалізацыі герменеўтычных працэдур. Сама інтэрпрэтацыя настолькі прасякнута моўнай фармулёўкай, што яе аўтар не ў стане зрабіць яе прадметам адмысловага аналізу і зразумець яе сапраўднае значэнне [6, с. 407].

Таму дадзеную задачу павінна ўзяць і бярэ на сябе філасофія, філасофская герменеўтыка, якая разгледзела ў жывой метафорыцы мовы глыбокую крыніцу ўсякага натуральнага ўтварэння паняццяў [6, с.436] і настойліва падкрэслівала ўніверсальны характар моўнай карціны свету, якая грунтуецца на натуральным дачыненні чалавека да рэчаіснасці [6, с. 454–457].

Супрацьлеглая (і не толькі ў плане разумення і арганізацыі міжкультурных дыялагічных стасункаў) інтэлектуальная стратэгія разглядае мову толькі як сродак інтэрсуб’ектыўнай Камунікацыі, які дзеля яго эфектыўнага ўжывання павінен функцыянаваць на наміналістычнай аснове (менавіта ў такім выпадку робіцца магчымым інтэрсуб’ектыўны кантроль адпаведных практык). Дадзены падыход найбольш выразна выявіўся ў абсягу крытычна-рацыяналістычнай традыцыі, прадстаўнікі якой арыентуюцца на пазнавальныя стандарты, уласцівыя навуцы сучаснага тыпу [3, с. 136–137].

Няма нічога дзіўнага ў тым, што ўзаемадачыненні паміж згаданымі філасофскімі кірункамі маюць надзвычай напружаны характар і што з боку прыхільнікаў кожнага з іх гучыць вострая крытыкана адрас апанентаў (Г.-Г.Гадамер, напрыклад, указвае, што герменеўтычны феномен губляецца праз «інструменталізацыю» мовы ў неадэкватных яе тэорыях [6, с. 407]; Д. Александровіч, наадварот, бачыць у герменеўтычнай тэорыі і практыцы пазбаўленыя рэальнага значэння моўныя гульні, вынікі якіх выключаюць аб’ектывацыю і інтэрсуб’ектыўны кантроль [2, с. 282]). Тым не менш пры выбудоўванні міжкультурных дыялагічных стасункаў абодва падыходы могуць (і павінны) быць задзейнічаны: выбар на карысць таго ці іншага з іх мусіць вызначацца канкрэтнымі ўмовамі, задачамі і мэтамі, у якіх і дзеля якіх адбываецца міжкультурная камунікацыя.

Неабходна адзначыць, што ў цэнтры ўвагі значнай групы сучасных філосафаў знаходзіцца надзвычай важны ў кантэксце вывучэння і рэалізацыі дыялога культур феномен міжкультурнасці. Ён разглядаецца найперш як выяўленне ўзаемнай бліз-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

касці і як падстава для далейшага збліжэння розных культурных асяродкаў. Пры гэтым адпаведны аналіз выводзіцца на ўзровень глабальных культурных утварэнняў, на ўзровень апазіцыі Захад – Усход. У якасці падставы іх узаемазбліжэння згаданыя тэарэтыкі ўказваюць менавіта набліжэнне адзін да аднаго іх філасофскіх падмуркаў, што здзяйсняецца праз паліфанічны дыялог, «у якім паасобныя філасофскія традыцыі ўзаемаадкрываюцца адна адной і могуць адна ў адной вучыцца» [2, с. 18].

Такім чынам, філасофія эксплііцытна і імпліцытна прысутнічае ў культуры і ў дыялогу культур. Дзякуючы сваёй рэфлексіўна-крытычнай існасці яна выяўляе, аналізуе і выбудоўвае падваліны, аснову міжкультурных дыялагічных стасункаў, распрацоўваючы разнастайныя стратэгіі іх эфектыўнага разгортвання.

---


1. *Бахтин, М. М.* Проблемы поэтики Достоевского / М. М. Бахтин. – Изд. 4-е. – М. : Сов. Россия, 1979. – 320 с.

2. *Aleksandrowicz, D.* Einige Probleme der philosophischen Übersetzung / D. Aleksandrowicz // Ruch Filozoficzny. – 1993. – Tom L. – № 3. – S. 281–286.

3. *Aleksandrowicz, D.* Kritischer Rationslismus und das Problem der Interdisziplinarität / D. Aleksandrowicz // Realismus. Disziplin. Interdisziplinarität / D. Aleksandrowicz und H. G. Ru (Hrsg.) – Amsterdam, Atlanta : Rodopi, 2001. – S. 131–152.

4. *Bickmann, C.* Vorwort. Einführung in die Themenstellung / C. Bickmann // Religion und Philosophie im Widerstreit? Internationaler Kongress an der Universität zu Köln, 13. – 16. Juli 2006 / C. Bickmann, M. Witz, H.-J.Scheidgen (Hrsg.). – Nordhausen : Traugott Bautz, 2008. – S. 11–19.

5. *Gadamer, H.-G.* Hermeneutik / H.-G.Gadamer // Historisches Wörterbuch der Philosophie: in 13 Bd. / hrsg. von J. Ritter, K. Gründer, G. Gabriel. – Basel : Schwabe Verlag, 1971–2007. – Bd. 3. – S. 1062–1073.

6. *Gadamer, H.-G.* Hermeneutik : Wahrheit und Methode / H.-G. Gadamer // Gesammelte Werke / H.-G. Gadamer. – Tübingen : J. C. B. Mohr (Paul Siebeck), 1990. – Bd. 1 : Grundzüge einer philosophischen Hermeneutik. – 495 S.

7. *Hegel, G. W. F.* Wissenschaft der Logik : in 2 Teilen / G. W. F. Hegel. – Berlin : Akademie-Verlag, 1975. – T. 1. – 401 S.

8. *Kant, I.* Kritik der reinen Vernunft : in 2 Bd. / I. Kant. – Bd. 1 // Werkausgabe : in 12 Bd. – Bd. 3. – Frankfurt am Main : Suhrkamp, 1992. – 340 S.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ